*Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!*
*ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ*



# Наша слова

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года    № 15 (854)    9 КРАСАВІКА 2008 г.

## Дарагія сябры “Нашага слова”!

У гэтым квартале колькасць падпісчыкаў у цэлым па краіне ў параўнанні з месяцам студзенем значна павялічылася, але гэтае павелічэнне было дасягнута ў асноўным у зімнія месяцы. А ў прынцыпе ўсе вобласці засталіся на звыклым узроўні, значна вырасла падпіска толькі ў Гомельскай вобласці за кошт горада Рагачова. Радуе рост асобных гарадоў, што сведчыць пра з’яўленне ў гэтых месцах нашых новых падпісчыкаў, а значыць і прыхільнікаў. Гэта Камянец, Пінск, Віцебск, Полацк, Смалявічы, Салігорск, Жыткавічы, Гародня, Карэлічы,Бабруйск. Будзем спадзявацца, што тэндэнцыя захаваецца, і хаця б невялікі рост колькасці падпісчыкаў будзе працягвацца.

| Берасцейская вобласць: | Студзень | Красавік |
|---|---|---|
| Баранавічы р.в. | 14 | 13 |
| Бяроза р.в. | 8 | 9 |
| Белаазёрск р.в. | 2 | 1 |
| Бярэсце гор. | 19 | 19 |
| Ганцавічы р.в. | 1 | 2 |
| Драгічын р.в. | 2 | 1 |
| Жабінка р.в. | 1 | 1 |
| Іванава р.в | 2 | 2 |
| Івацэвічы р. в. | 7 | 7 |
| Камянец р.в. | 6 | 9 |
| Кобрын гор. | 2 | 2 |
| Лунінец гор. | 1 | 1 |
| Ляхавічы р.в. | 1 | 2 |
| Маларыта р.в. | 1 | - |
| Пінск гор. | 13 | 16 |
| Пружаны р.в. | 11 | 11 |
| Столін р.в. | 6 | 3 |
| **Усяго:** | **97** | **99** |

| Віцебская вобласць: | Студзень | Красавік |
|---|---|---|
| Бешанковічы р.в. | 1 | 1 |
| Браслаў р.в. | 1 | 2 |
| Віцебск гор. | 26 | 29 |
| Віцебск РВПС | 2 | 1 |
| Верхнедзвінск р.в. | 11 | 10 |
| Глыбокае р.в. | 8 | 8 |
| Гарадок р.в. | 4 | 4 |
| Докшыцы р.в. | 3 | 3 |
| Дуброўня р.в. | 1 | 1 |
| Лёзна р.в. | 1 | 1 |
| Лепель р. в. | 3 | 5 |
| Міёры р.в. | 3 | 3 |
| Наваполацк гор. | 31 | 27 |
| Ворша гор. | 5 | 5 |
| Полацк гор. | 12 | 14 |
| Паставы р.в. | 6 | 6 |
| Расоны р.в. | 1 | 1 |
| Сянно р.в. | 1 | 1 |
| Талочын р.в. | 1 | 1 |
| Ушачы р.в. | 2 | 2 |
| Чашнікі р.в. | 1 | 1 |
| Шаркоўшчына р.в. | 9 | 8 |
| Шуміліна р.в. | 1 | - |
| **Усяго:** | **134** | **134** |

| Менская вобласць: | Студзень | Красавік |
|---|---|---|
| Беразіно р.в. | 5 | 5 |
| Барысаў гор. | 4 | 4 |
| Вілейка гор. | 3 | 3 |
| Валожын гор. | 9 | 7 |
| Дзяржынск р.в. | 5 | 6 |
| Жодзіна гор. | 5 | 5 |
| Клецк р.в. | 1 | 1 |
| Крупкі р.в. | 2 | 2 |
| Капыль р.в. | 1 | 2 |
| Лагойск | 4 | 5 |
| Любань р.в. | 2 | 2 |
| Менск гор. | 294 | 299 |
| Менск РВПС | 12 | 14 |
| Маладзечна гор. | 19 | 20 |
| Мядзель р.в. | 2 | 3 |
| Пухавічы РВПС | 10 | 10 |
| Нясвіж р.в. | 5 | 4 |
| Смалявічы р.в. | 1 | 3 |
| Слуцк гор. | 12 | 13 |
| Салігорск гор. | 8 | 14 |
| Ст. Дарогі р.в. | - | 1 |
| Стоўбцы р.в. | 2 | 3 |
| Узда р.в. | 2 | 1 |
| Чэрвень р.в. | 4 | 4 |
| **Усяго:** | **381** | **431** |

| Гомельская вобласць: | Студзень | Красавік |
|---|---|---|
| Буда-Кашалёва | 2 | 1 |
| Брагін р.в. | 2 | 2 |
| Ветка р.в. | 1 | 1 |
| Гомель гор. | 45 | 46 |
| Гомель РВПС | 3 | 6 |
| Добруш р.в. | 1 | 1 |
| Ельск р.в. | 1 | 1 |
| Жыткавічы р.в. | 14 | 18 |
| Жлобін гор. | 3 | 4 |
| Калінкавічы гор. | 3 | 4 |
| Карма р.в. | 3 | 4 |
| Лельчыца р.в. | - | 1 |
| Лоеў р.в. | 2 | 3 |
| Мазыр гор. | 3 | 2 |
| Акцябарскі р.в. | 2 | 1 |
| Нароўля р.в. | - | - |
| Петрыкаў р.в. | 3 | 3 |
| Рэчыцца гор. | - | 3 |
| Рагачоў гор. | 1 | 42 |
| Светлагорск гор. | 4 | 5 |
| Хойнікі р.в. | 1 | 1 |
| Чачэрск р.в. | 1 | - |
| **Усяго:** | **95** | **149** |

| Гарадзенская вобласць: | Студзень | Красавік |
|---|---|---|
| Бераставіца | 7 | 7 |
| Ваўкавыск гор. | 11 | 11 |
| Воранава р.в. | 5 | 4 |
| Гародня гор. | 46 | 49 |
| Гародня РВПС | 10 | 11 |
| Дзятлава р.в. | 9 | 8 |
| Зэльва р.в. | 2 | 2 |
| Іўе р.в. | 6 | 5 |
| Карэлічы р.в. | 5 | 7 |
| Масты р.в. | 8 | 8 |
| Наваградак гор. | 6 | 6 |
| Астравец р.в. | 7 | 7 |
| Ашмяны р.в. | 7 | 7 |
| Смаргонь гор. | 12 | 11 |
| Слонім гор. | 12 | 12 |
| Свіслач р.в. | 4 | 4 |
| Шчучын р.в. | 6 | 7 |
| Ліда | 12 | 12 |
| **Усяго:** | **175** | **178** |

| Магілёўская вобласць: | Студзень | Красавік |
|---|---|---|
| Бабруйск гор. | 6 | 8 |
| Бабруйск РВПС | - | - |
| Бялынічы р.в. | 1 | 1 |
| Быхаў р.в. | 2 | 2 |
| Глуск р.в. | 1 | 1 |
| Горкі гор. | 2 | 2 |
| Дрыбін р.в. | - | - |
| Кіраўск р.в. | 1 | 2 |
| Клічаў р.в. | 1 | - |
| Клімавічы р.в. | 2 | - |
| Касцюковічы р.в. | 2 | 2 |
| Краснаполле р.в. | 1 | 1 |
| Крычаў р.в. | 1 | 1 |
| Круглае р.в. | 2 | 2 |
| Мсціслаў р.в. | 1 | 1 |
| Магілёў гор. | 55 | 56 |
| Магілёў РВПС | 2 | 2 |
| Асіповічы гор. | 6 | 5 |
| Слаўгарад р.в. | 1 | 1 |
| Хоцімск р.в. | 1 | 1 |
| Чэрыкаў р.в. | 2 | - |
| Чавусы р.в. | 2 | 1 |
| Шклоў р.в. | 5 | 3 |
| **Усяго** | **97** | **92** |
| **Усяго на краіне** | **994** | **1083** |

# Курс “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” у беларускіх ВНУ пакуль застаецца

*Вось ужо каторы год з зайздросным пастаянствам Міністэрства адукацыі спрабуе ліквідаваць у ВНУ Беларусі курс “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, і каторы год ТБМ прыкладвае вялікія намаганні, каб гэты курс адстаяць.*

*Сёлета па ўсёй краіне зноў былі сабраныя многія сотні подпісаў за захаванне курса ў 2008/09 навучальным годзе. Подпісы накіроўваліся ў адрас Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Г.М. Нявыгласа. І вось, мяркуючы па адказу з Міністэрства адукацыі, пытанне на наступны год вырашана. А што будзе далей, пакажа час. Можа быць, Міністэрства для сваіх эксперыментаў знойдзе якую іншую дысцыпліну, скажам, вышэйшую матэматыку?*

*Наш кар.*

00027626

**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
вул. Савецкая, 9
220010, г. Мінск
тэл. 227-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
ул. Советская, 9
220010, г. Минск
тел. 227-47-36, факс 200-84-83
E-mail: root@minedu.unibel.by

12.03.2008 № 06-07/648

На № ____________ от ______________

Грамадскае аб’яднанне
“Таварыства беларускай мовы
імя Францыска Скарыны”
Трусаву А.А.

**Паважаны Алег Анатольевіч!**

У Міністэрстве адукацыі разгледжаны Ваш чарговы зварот на імя Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Г.М. Нявыгласа аб уключэнні курса “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” у адукацыйны стандарт па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах для вышэйшых навучальных устаноў. Паведамляем наступнае.

Міністэрства адукацыі праводзіць сістэмную работу па пашырэнні выкарыстання беларускай мовы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі.

Як паведамлялася Вам раней, у агульнаадукацыйных установах створаны ўсе ўмовы для якаснага авалодання вучнямі беларускай мовай.

Разам з тым, з мэтай забеспячэння падрыхтоўкі спецыялістаў, якія валодаюць беларускамоўнай прафесійнай лексікай, Міністэрства адукацыі рэкамендавала ўсім вышэйшым навучальным установам арганізаваць пры пераходзе на новы адукацыйны стандарт выкладанне абавязковага курса “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”.

**Першы намеснік Міністра  А.І. Жук.**

# Аляксандра Нарбутоўна, лідзянка – акадэмік Берлінскай акадэміі

## *(220 гадоў назад першая беларуска стала акадэмікам)*

У кнізе М. Балінскага “Даўняя Віленская акадэмія” (Balinski Michal. Dawna academia Wilenska. 1862. Petersburg) на старонцы 322 прачытаў *“… у той час у Вільні кожны адукаваны месціч, альбо хто меў адносіны да навукі, моцна быў усхваляваны навіной, якая толькі што разышлася па горадзе, што агульнавядомая сваімі талентамі і адукаванасцю, высакародная літоўская панна Аляксандра Нарбутоўна* (Alexandra Narbutowna, у Балінскага з адной „t”, у іншых крыніцах з дзвюмя)*, дачка падкаморага лідскага, была выбрана сябрам Акадэміі навук у Берліне, на паседжанні 19 студзеня 1788 г., і патэнт на тое з рук прускага князя Генрыха атрымала. Усцешыла гэта многіх асоб і асабліва шматлікую радню. Некаторыя здзіўляліся гэтаму і лічылі гэта не жаночай справай, а ў некаторых, як гэта часта бывае ў свеце, гэты факт узбуджаў зайздрасць, калі не здзекі.”*

**Жанчына - акадэмік у ВКЛ у 18 ст.!**

Хуткі пошук інфармацыі аб землячцы нічога не даў. Але ж пасля доўгіх пошукаў удалося знайсці крэскі да біяграфіі Аляксандры Нарбут.

Бацька – Тадэвуш Нарбут (каля 1740-?) герба “Задора”, падкаморы лідскага павета і каралеўскі шамбелян, сын Казіміра Юзафа Нарбута (каля 1700-?). Ад першага шлюбу ў Тадэвуша Нарбута каля 1760 г. нарадзілася тры дачкі: Канстанцыя, Аляксандра і Тэкля, ад другога шлюбу з Кацерынай Вяжэвіч - сын Войцах (1762-1837, каралеўскі шамбелян, посол сейма 1788 г. ад Лідскага павету) і дачка Ганна. Па ўдакладненай інфармацыі Ч. Малеўскага ў 1790 г. Тадэвушу Нарбуту ў лідскай парафіі належала Зарэчча (прыгарад Ліды, магчыма з гарадскім домам і зямля каля горада), ваколіца Бельскія, Плясавічы, фальварак Сукурчы. Такім чынам, Аляксандра і Канстанцыя, верагодна, былі карэннымі лідзянкамі.

Муж Аляксандры Нарбутоўны – Станіслаў Цясельскі (1750-1823, Stanisiaw Ciesielski), і таму яна вядома таксама як Аляксандра Цясельская.

Сёстры Канстанцыя і Аляксандра выхоўваліся і атрымлівалі адукацыю ў Пулавах (пад Люблінам) пры двары княгіні Ізабэлы Чартарыскай (з Флемінгаў, 1745-1835). У той час князь Адам Казімір Чартарыскі разам з жонкай, стварыў у Пулавах сапраўдны асяродак навукі і мастацтва. Пры княжым двары жылі і працавалі мастакі Я. Норблін, З. Фогель, К. Вайнякоўскі, Я. Рыхтар, пісьменнікі Ф. Княжнін, Я. Вароніч, Я. Нямцэвіч, архітэктары Ч. Айгнер, Я. Хемпель, музыканты Вінцэнт і Францішак Лясловы. У палацы была выдатная бібліятэка, фінансаваліся навуковыя даследаванні у галінах філалогіі, літаратуры, гісторыі. Для навуковай працы прыцягваліся лепшыя навукоўцы Еўропы. Пры двары атрымоўвала адукацыю і выхаванне таленавітая моладзь. Таму ў 19 стагоддзі Пулавы зваліся “Польскімі Афінамі”. Вядома, што княгіня Ізабэла Чартарыская вельмі добра адносілася да сёстраў Нарбут.

Аляксандра Нарбутоўна стала знакамітай актрысай, перакладчыцай і літаратарам. Яе прозвішча ёсць у спісе літарататараў Яна Савінскага (Jan Sowinski. O Uczonych Polkach wyd. Warszawa i Krzemieniec N. Glunсksber 1821).

У “Гісторыі літаратуры польскай …” Фелікса Бенткоўскага (Historya literatury polskiej w spisie dziel drukiem ogloszonych. Fielix Bentkowski. Warz. i Wilnia, 1814 S. 566.) ёсць інфармацыя аб перакладзе п’есы дэ Жанліс “Зэлія, альбо шчырасць”. Выходныя дадзеныя перакладу п’есы дэ Жанліс : Zelia, czyli Szczerosc (Zelia, albo Szczera; Zelia czyli Osobliwsze wychowanie). Kom. W 5 a. Narbutowna Al. (1790). Jadowski R. Warsz. 1793.

Знайшлася і інфармацыя аб ролях у некалькіх спектаклях, дзе яна іграла. Гэта роля Тэлэзіі ў оперы з 3-х актаў “Маці Спартанка” Францішка Княжніна. У гэтай оперы іграла і сястра Канстанцыя, старэйшая сястра Аляксандры (па мужу – Дэмбоўская) таксама таленавітая і папулярная актрыса і кампазітар, а таксама сама княгіня Ізабэла Чартарыская ў ролі Тэоны. Спектакль ставіўся ў тэатры Пулаў (Dzeila Franciszka Dyonizego Kniaznina. T. IV., Warsz. 1828, S.5.); роля Кліадоры ў п’есе Княжніна “Паветраны шар, ці Пулаўскія вечары”, там жа ў ролі Ірыс - Канстанцыя Нарбутоўна. (Dziela Franciszka Dyonizego Kniaznina. T. III., Warsz. 1837, S.7.)

***Леанід Лаўрэш.***

pawet.net